## ПАЛАЖЭННЕ АБ ПРЭМІІ ЦЁТКІ
**за найлепшую кнігу для дзяцей і падлеткаў**

### I. ПРЭМІЯ

1.1. Заснавальнікамі прэміі з’яўляюцца РГА "Саюз беларускіх пісьменнікаў", дабрачынны фонд “Вяртанне” і Беларускі ПЭН-цэнтр.

1.2. Прэмія прысуджаецца штогод за найлепшую кнігу для дзяцей і падлеткаў, напісаную на беларускай мове, а таксама за найлепшае мастацкае афармленне кнігі для дзяцей.

1.3. Прэмія ўручаецца ў некалькіх намінацыях. Паводле рашэння журы колькасць намінацый можа вар’іравацца. У выпадку калектыўнага аўтарства прэмія дзеліцца між усімі аўтарамі (або ілюстратарамі – у залежнасці ад намінацыі) кнігі-пераможцы.

1.3.1. Прэмія ў намінацыі “Найлепшая дзіцячая кніга” ўручаецца незалежна ад роду літаратуры (проза, паэзія, драматургія) аўтару арыгінальнай беларускай кнігі.

1.3.2. Прэмія ў намінацыі “Мастацкае афармленне” ўручаецца мастаку-ілюстратару кнігі.

1.3.3. Журы мае права прысудзіць дадатковую прэмію адметнай кнізе, што не адпавядае крытэрыям галоўнай намінацыі (напрыклад, найлепшай перакладной кнізе, коміксу, падручніку, нон-фікшн і пад.).

1.4. Кніга павінна быць выдадзеная ў папяровым альбо электронным выглядзе ў год, у якім быў абвешчаны конкурс.

1.5. Канчатковае рашэнне аб прыняцці кнігі да разгляду ў прэміі (вызначэнне, ці адпавядае кніга паняццю “літаратура для дзяцей і падлеткаў”) прымае журы.

1.6. Узнагароды: у кожнай намінацыі вызначаецца адзін пераможца, заахвочвальных прызоў не даецца.

1.7. Кнігу, якая заяўлена да ўдзелу ў конкурсе, нельга выключыць з удзелу паводле жадання аўтара, выдаўца, ілюстратара, перакладчыка.

## II. КОНКУРС

2.1. Конкурс складаецца з 4 этапаў:

1 этап: аргкамітэт абвяшчае прэмію ў канцы года;
2 этап: аргкамітэт прымае кнігі на конкурс да 31 студзеня наступнага года;
3 этап: аргкамітэт абвяшчае поўны спіс кніг, прынятых да ўдзелу ў конкурсе;
4 этап: журы вызначае пераможцу ў кожнай з намінацыяў.

2.2. Пераможца ў любой з намінацыяў можа ўдзельнічаць у конкурсе ў любых намінацыях у наступных сезонах.

2.3. Заяўляць кнігі на конкурс упаўнаважаныя:
а) выдавецтвы;
б) аргкамітэт прэміі;
в) члены журы;
г) сам аўтар або мастак.

2.4. Калі аўтар або мастак у адзін год выдаў некалькі кніг, да ўдзелу ў конкурсе можа быць прынятая кожная кніга.

2.5 У конкурсе не ўдзельнічаюць творы сябраў журы і сябраў аргкамітэту прэміі.

## III. ЖУРЫ

3.1. Журы конкурсу фармуецца аргкамітэтам і ўзгадняецца з Радай ПЭН-Цэнтра. У склад журы ўваходзяць таксама мастакі, якія вырашаюць, каму будзе прысуджана прэмія за мастацкае афармленне.

3.2. Працу журы курыруе аргкамітэт прэміі (гл. раздзел V).

3.3. Журы прымае рашэнні на падставе дадзенага Палажэння аб прэміі. Па пытаннях, не ўрэгуляваных Палажэннем, журы прымае рашэнні згодна з уласным меркаваннем, кіруючыся прынцыпамі слушнасці, характарам прэміі і яе падставаў.

3.4. Журы прымае рашэнні на пасяджэннях у форме пастаноў кансэнсусам.

## IV. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СЯБРАЎ ЖУРЫ

4.1. Сябры журы абавязаныя прачытаць усе кнігі, прынятыя да удзелу ў конкурсе.

4.2. На кожны год уручэння прэміі прыпадае як мінімум 2 пасяджэнні журы, прысвечаныя выбару кніг:

1. устаўное пасяджэнне, на якім зацвярджаецца поўны спіс кніг-намінантаў;
2. фінальнае пасяджэнне, на якім вызначаюцца кнігі-пераможцы.

4.4. Сябры журы абавязаныя захоўваць у таямніцы ўсе рашэнні, прынятыя на пасяджэннях.

4.5. Сябры журы не маюць права абмяркоўваць публічна працу журы да ўручэння прэміі. У адваротным выпадку сябра журы можа быць выключаны з яго складу.

## V. АРГКАМІТЭТ ПРЭМІІ

5.1. Аргкамітэт прэміі вызначаецца і зацвярджаецца Радай Беларускага ПЭН-цэнтра.

5.2. Аргкамітэт не мае права голасу пры выбары лаўрэатаў.

5.3. У абавязкі аргкамітэта ўваходзіць:
а) падрыхтоўка інфармацыйных матэрыялаў для сябраў журы пра:
— заяўленыя да ўдзелу ў прэміі кнігі да І пасяджэння журы ў год прысуджэння прэміі;
— намінаваныя кнігі да кожнага пасяджэння журы;
б) складанне пратаколаў пасяджэнняў журы;
в) пастаянны кантакт з сябрамі журы, у тым ліку інфармаванне іх пра тэрміны і парадак дня пасяджэнняў;
г) арганізацыя бягучай работы журы і рэагаванне на прынятыя ім рашэнні;
д) распрацоўка дызайну і фірмовага стылю прэміі;
е) арганізацыя і каардынацыя іншых відаў работ, звязаных з прэміяй.

## VI. МЕХАНІЗМ ВЫБАРУ ПЕРАМОЖЦАЎ

Члены журы прымаюць рашэнні калегіяльна, кансэнсусам, у выніку абмеркавання кніг-намінантаў.

23 кастрычніка 2016 Рада Беларускага ПЭН-цэнтра